Агееў, А. Р. Методыка і вопыт правядзення гісторыка-краязнаўчай практыкі на гістарычным факультэце Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А. А. Куляшова. / А. Р. Агееў // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Вып. 2 / Рэдкал.: С. М. Ходзін (адказ. рэд.) і інш. – Мн.: БДУ, 2005. – С. 49–51.

**А. Р. Агееў**

# Методыка і вопыт правядзення гісторыка-краязнаўчай практыкі на гістарычным факультэце Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А. А. Куляшова

Ва ўмовах фарміраваня нацыянальнай дзяржавы гуманітарызацыі і перабудовы адукацыі значна ўзрасла цікавасць да айчыннай гісторыі,да культуры свайго народа, да свайго краю. Краязнаўства з'яўляецца найбольш даступнай формай далучэння студэнтаў да самастойнай пазнавальнай і навукова — даследчай дзейнасці, адным з найбольш эфектыўных сродкаў сувязі сярэдняй і вышэйшай школы з жыццём і культурай рэгіёна. Сістэматычнае вывучэнне роднага краю фарміруе трывалы навуковы і культурны патэнцыял гістарычных ведаў, дазваляе студэнтам набыць ўменні і навыкі, якія неабходныя ў далейшай навуковай, педагагічнай ці іншай практычнай дзейнасці. Гэта асабліва важна сёння, калі ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларумсь, спецыяліст павінен не толькі мець высокі узровень гуманітарных, сацыяльных, агульнанавуковых, агульнапрафесіянальных, спецыяльных ведаў, але і назапашваць практычныя навыкі, якія дазваляюць здяйсняць актыўную прафесійную дзейнасць.

Практыкі з'яўляюцца часткай агульнага працэса падрыхтоўкі спецыялістаў, працягам вучэбнага працэса ў вытворчых і палявых умовах. Комплексная гісторыка — краязнаўчая практыка накіравана на авалоданне вытворчымі навыкамі і перадавымі тэхналогіямі, на замацаванне тэарэтычных ведаў па гісторыі і этналогіі Беларусі, гістарычнаму краязнаўству і дапаможным гістарычным дысцыплінам, якія атрыманы студэнтамі ў працэсе навучання ў вышэйшых



навучальных установах. Яна паказвае студэнтам усю разнастайнасць гістарычных крыніц, абуджае цікавасць да навуковых пошукаў і будучай прафесіі. дазваляе далучацца да навуковай дзейнасці, фарміруе уменні збіраць і аналізаваць інфармацыю, Практыка павінна праходзіць ў палявых ўмовах, што мае не толькі навуковае і адукацыінае значэнне,але і дазваляе студэнтам набыць навыкі арганізацыйнай работы і самакіравання. дапамагае наладжванню добрых сяброўскіх узаемаадносін унутры студэнцкіх груп.

Пад час праходжання комплекснай гісторыка — краязнаўчай практыкі аб'ектамі вывучэння з'яўляюцца помнікі гісторыі і культуры, асноўныя накірункі дзейнасці музеяў,краязнаўчых аддзелаў бібліятэк і пазашкольных выхаваўчых і турыска — краязнаўчых арганізацый, архівы, прадрыемствы, населеныя пункты і прырода роднага краю.Студэнты знаёмяцца з шматлікай краязнаўчай літаратурай, рыхтуюць і праводзяць экскурсіі, пазнаюць прынцыпы арганізацыі і методыку дзейнасці дзяржаўнага, школьнага і аматарскага краязнаўства. Практыка праводзіцца на базе помнікаў, музеяў, архіваў і краязнаўчых арганізацый Магілёўскай вобласці. Пад час яе аадбываюцца экскурсіі на вядучыя нацыянальныя а'бекты.

## ПРАГРАМА КОМПЛЕКСНАЙ ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧАЙ ПРАКТЫКІ

Комплексная гісторыка-краязнаўчая практыка з'яўляецца прадаўжэннем вучэбнага працэсу ў вытворчых умовах і складаецца з гісторыка-краязнаўчай, архіўнай, музейнай практык і палявых даследванняў.

Інструкцыі па правядзенню практыкі і краязнаўчых даследванняў.Патрабаванні тэхніцы бяспекі пры правядзенні палявых работ.

Гісторыка-краязнаўчая практыка. А'бекты краязнаўчых даследванняў. Віды помнікаў гісторыі і культуры. Археалагічныя, гістарычныя і архітэктурныя помнікі рэгіёна. Гістарычныя мясціны і мемарыялы. Вядучыя прадпрыемствы і ўстановы, насельніцтва і прырода рэгіёна. Збор матэрыялаў аб помніках, вывучэнне іх гісторыі. Падрыхтоўка і правядзенне экскурсій па

краязнаўчых аб'ектах. Агляд помнікаў і мясцін. Збор дадатковых звестак. Магілёўская абласная турысцка-краязнаўчая экспедыцыя навучэнцаў і педагогаў «Наш край прыдняпроўскі.»



Архіўнай практыка. Гісторыя архіўнай справы Віды архіваў, —ункцыі і задачы.Тэхналогія фарміравання архіўных фондаў. Прынцыпы інфармацыйнай і даследчай работы архіваў.Знаёмства з практыкай работы магілёўскіх архіваў.

Музейнай практыка. Гісторыя музейнай справы. Азнаямленне з практыкай камплектавання і выкарыстання музейных фондаў. Прінцыпы збору музейных матэрыялаў. Навуковая апрацоўка,. апісанне, улік і захоўванне музейных прадметаў. Каталогі музейных фондаў. Прынцыпы і задачы пабудовы музейнай экспазіцыі па разделах гісторыі. Вывучэнне экспазіцый, знаёмства з фондамі, часовымі і перасоўнымі выставамі лепшых музеяў Магілёўскай вобласці і краіны: у тым ліку гг.Магілёва, Мсціслава, Мінску, Полацка, Навагрудка, Міра, Нясвіжа. Экскурсійна-асветніцкая работа музеяў.

Палявыя даследванні. Гісторыя зараджэння і развіцця палявых этналагічных і краязнаўчых даследванняў. Ахова помнікаў гісторыі і культуры.

Падрыхтоўка экспедыцыі: вызначэнне разам са студэнтамі задач даследванняў і складанне яе праграмы. Арганізацыя палявога лагера і побыта на пачатках самаабслугоўвання. Выпрацоўка ў студэнтаў навыкаў правядзення шматдзённага пахода і палявых летнікаў са школьнікамі.

Правядзенне этнаграфічных даследванняў. Сялянскі побыт беларусаў. Драўлянае дойлідства, інтэр'ер беларускай хаты, хатняе начынне. Народны касцюм і нацыянальны арнамент.Сямейныя і каляндарныя святы, звычаі і традыцыі. Запіс фальклорных твораў. Этнаграфія сучаснага побыту. Сувязь этнаграфічнага матэрыялу з гісторыяй народа. Збор прадметаў матэрыяльнай культуры для музейных калекцый МДУ імя А.А.Куляшова і музеяў горада Магілёва.

Тапонімы, як гістарычная крыніца. Запіс тапонімаў, у тым ліку гідронімаў, урбанонімаў ды інш.Першаснае даследванне гісторыі іх узнікнення. Адлюстраванне ў тапонімах канкрэтна — гістарычных падзей і гісторыі народа.

Складанне паашпартоў населеных пунктаў.

Палявая апрацоўка і кансервацыя сабраных матэрыялаў. Падвядзенне вынікаў экспедыцыі.



* * *

Практыка мае і вялікае выхаваўчае значэнне. Пад час яе правядзення вялікая ўвага надаецца выхаванню любові да свайго краю, да Бацькаўшчыны і яе гісторыі. Краязнаўчыя заняткі пашыраюць далягляд студэнтаў, дазваляюць ім убачыць, як гістарычныя працэсы прэламляюцца ў лёсах людзей, выяўляюцца ў рэгіянальнай гісторыі. Рамантыка краязнаўчых пошукаў не толькі актывізуе пазнавальную дзейнасць студэнтаў, але і знаёміць з жыццём розных сацыяльных груп грамадства.Усё гэта спрыяе фарміраванню людзей творчых нераўнадушных да сваёй гісторыі і культуры.

Для правяжзення практыкі на кафедры падрыхтаваны неабходныя нарматыўныя і метадычныя дакументы. Сярод іх вылучым: «Палажэнне і інструкцыю па арганізацыі і правядзенню комплекснай гісторыка-краязнаўчай практыкі на гістфаке МДУ імя А.Куляшова»,»Інструкцыю па тэхніцы бяспекі пры правядзенні вучэбна-палявых практык», «Навуковае апісанне музейнага прадмета»,«Інструкцыю па тэхніцы бяспекі пры выкананні работ у зоне былых баявых дзеянняў»,«Заданні для музейнай краязнаўчай практыкі»,«Рэкамендацыі па методыцы краязнаўчых даследванняў»,матэрыялы «Магілёўскай абласной турысцка-краязнаўчай экспедыцыі навучэнцаў і педагогаў «Наш край прыдняпроўскі».